УДК 392(476)+303.425.5 DOI 10.63874/2218-0281-2025-2-52-57

***Ала Мікалаеўна Нароўская***
*канд. гіст. навук, дац.,*
*дактарант Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
***Ala Narouskaya***
*Candidate of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Doctoral Student of the Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature*
*of National Academy of Sciences of Belarus*
e-mail: anarovskaya@gmail.com

# ЭТНАГРАФІЧНЫЯ ЭКСПЕДЫЦЫІ ПА ВЫЯЎЛЕННІ І АТРЫБУЦЫІ ТРАДЫЦЫЙНАГА ЖЫЛЛЯ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ (1960–1980-я гг.)

*Разглядаецца пытанне музеефікацыі традыцыйнага жылля беларусаў у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Аналізуюцца архіўныя матэрыялы па выяўленні і атрыбуцыі жылля і гаспадарчых пабудоў, унутранага абсталявання традыцыйнага жылля Заходняга Палесся. Прыводзяцца звесткі аб выяўленых асаблівасцях інтэр'ера жылля.*

***Ключавыя словы:*** *традыцыйнае жыллё, этнаграфічныя экспедыцыі, музей, атрыбуцыя, семіётыка.*

## *Ethnographic Expeditions to Identify and Attribute Traditional Dwelling in Western Polesie (1960–1980s)*

*The issue of museumification of a traditional dwelling in the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Life is considered. Archival materials on the identification and attribution of residential and utility buildings, the internal structure of a traditional dwelling of Western Polesie are analyzed. Information on the identified features of the interior of the dwelling is provided.*

***Key words:*** *traditional dwelling, ethnographic expeditions, museum, attributions, semiotics.*

### Уводзіны

Актуальнасць даследавання традыцыйнага жылля Заходняга Палесся ў канцы 1960-х – 1980-я гг. была абумоўлена тым, што паўстала пытанне аб музеефікацыі помнікаў драўлянага дойлідства на тэрыторыі Беларусі. Адной з форм захавання і папулярызацыі этнаграфічных помнікаў у свеце ў той час былі скансены – музеі пад адкрытым небам.

9 снежня 1976 г. Савет Міністраў БССР прыняў Пастанову аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Пры Міністэрстве культуры БССР была арганізавана Рабочая група па стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНАП). У склад яе ўвайшлі архітэктары і этнографы. Першапачаткова Рабочая група была падзелена на тры аддзелы: «Цэнтральная Беларусь і Панямонне», «Паазер'е і Падняпроўе», «Заходняе і Усходняе Палессе». У канцы 1970-х – пачатку 1980-х гг. у аддзеле «Заходняга і Усходняга Палесся» працавалі: загадчык аддзела, архітэктар М. І. Лукьянчык, архітэктары В. В. Вядрэнка, М. М. Ведзянееў, этнографы У. У. Тутаеў, А. М. Нароўская.

Метадалагічна істотна было ўсталяваць храналагічныя рамкі даследавання традыцыйнага жылля. У іх вызначэнні вырашальную ролю адыграла вывучанасць традыцыйнага жылля на працягу дасягальнай для этнографаў мяжы (гэта другая палова XIX – пачатак XX ст.); неабходна было даць характарыстыку яго, зыходзячы з тых пабудоў, якія захаваліся і былі выяўлены архітэктарамі і этнографамі ў канцы 1970-х – 1980-я гг.

Былі вызначаны асноўныя кірункі дзейнасці навукоўцаў у этнаграфічных экспедыцыях: выяўленне і апісанне (атрыбуцыя) традыцыйнага жылля і гаспадарчых пабудоў, на аснове аналізу якіх і параўнанні з аналагічнымі традыцыйнымі пабудовамі рэгіёна было зроблена заключэнне аб часе і месцы яго бытавання, прыналежнасці, сацыяльным і этнічным асяроддзі і іншых характарыстыках [1, с. 54].

Для даследавання традыцыйнага жылля Заходняга Палесся важнае значэнне маюць матэрыялы этнаграфічных экспедыцый, справаздачы аб якіх захоўваюцца ў архівах Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНАП) і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У працэсе натурнага даследавання, фотафіксацыі, вывучэння архіўных матэрыялаў з'явілася магчымасць правесці атрыбуцыю амаль усіх жылых і гаспадарчых пабудоў, помнікаў драўлянага сакральнага дойлідства, малых архітэктурных форм, зафіксаваных у Заходнім Палессі.

Згодна з архіўнымі матэрыяламі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, ўжо ў 1977 г. было праведзена 10 этнаграфічных экспедыцый, з іх тры ў Заходнім Палессі [2].

Пры напісанні артыкула былі выкарыстаны даследаванні А. М. Харузіна [3], А. І. Лакоткі [4], Л. А. Малчанавай [5], С. А. Мілючэнкава [6], В. С. Цітова [7].

Мэта артыкула – даследаваць матэрыялы этнаграфічных экспедыцый па выяўленні жылых і гаспадарчых пабудоў Заходняга Палесся канца XIX – пачатку XX ст.

Задачы артыкула:

1) вылучыць асноўныя тыпы планіроўкі традыцыйнага жылля рэгёна;

2) разгледзець тэхніку драўлянага будаўніцтва;

3) прааналізаваць канструкцыйныя дэталі традыцыйных пабудоў;

4) даследаваць унутраную планіроўку жылля Заходняга Палесся.

**Асноўная частка**

***Тыпы сядзіб.*** У залежнасці ад размяшчэння на сядзібе жылых і гаспадарчых пабудоў выдзяляюць некалькі тыпаў планіроўкі сядзібы. Згодна з архіўнымі матэрыяламі у Заходнім Палессі пераважалі сядзібы пагоннага тыпу, якія ўтваралі шчыльныя цесныя двары. Пры такой забудове ўсе будынкі былі выцягнуты ў адну ці дзве паралельныя лініі і накрыты агульнай страхой. Такім чынам, пагонны двор мае два падтыпы: аднарадны і двухрадны. Для Заходняга Палесся быў характэрны аднарадны пагонны двор. У час этнаграфічных экспедыцый у Брэсцкую вобласць аднарадныя пагонныя двары былі зафіксаваны ў Брэсцкім раёне (вёскі Яцкавічы і Матыкалы) [8, арк. 99]; Камянецкім раёне (вёскі Кусцічы, Турна Вялікая, Грушаўка, Плянта, Радасць, Ражкоўка, Камароўшчына) [8, арк. 99–101] і іншых раёнах Брэсцкай вобласці.

Пра сядзібы пагоннага тыпу гэтага рэгіёна можна знайсці цікавыя звесткі ў даследаванні А. І. Лакоткі, які адзначае, што ў Заходнім Палессі пераважалі аднарадныя пагонныя сядзібы, у суседнім рэгіёне Панямонні – двухрадныя [4, с. 48–49]. Даследуючы развіццё структуры лінейных сядзіб, Л. А. Малчанава адзначала, што на эвалюцыю пагоннай забудовы рашаючы ўплыў аказала валочная рэформа [5, с. 27]. Разам з пагонным тыпам сядзіб у Заходнім Палессі сустракаліся двары з незвязанымі пабудовамі, якія, верагодна, з'яўляліся тут больш старажытным тыпам. Аб аналагічнай забудове з незвязанымі будынкамі сведчаць матэрыялы этнаграфічных экспедыцый у Заходняе Палессе. Так, у архіўных матэрыялах адзначаецца, што тып сядзібы з незвязанымі пабудовамі сустракаўся ў Пінскім р-не [9, арк. 50]. Па словах жыхароў в. Дварышча Маларыцкага р-на, «сістэмы пры рассяленні іх дзяды не ведалі, там дзе быў бугарок, узвышша над балотам, завозілі туды зямлю і ставілі пабудову» [10, арк. 12].

Для будаўніцтва жылля ў Заходнім Палессі выкарыстоўвалі сасну, радзей яліны. Традыцыйнай тэхнікай драўлянага будаўніцтва была зрубная тэхніка. Як па характары зруба, так і па форме страхі жыллё і гаспадарчыя пабудовы Заходняга Палесся лёгка адрозніць ад аналагічных архітэктурных збудаванняў іншых рэгіенаў Беларусі. Зруб жылля складаўся пераважна з пілаваных або расколатых уздоўж бярвенняў. Колькасць вянцоў залежала ад заможнасці гаспадара, звычайна ў доме было 10–15 вянцоў. Згодна з архіўнымі матэрыяламі, у в. Радасць Камянецкага р-на была зафіксавана хата ў 7 вянцоў [8, арк. 102]. Трывалая канструкцыя сцен утваралася пры дапамозе розных спосабаў злучэння бярвенняў і «дылей» у вянцы: у просты вугал («у чашку», «у просты замок») і чысты вугал («чысты», «гладкі», «нямецкі») [6, с. 154]. Ніжнія бярвёны звычайна былі дубовыя і з'яўляліся прасцейшым відам падмурка («падруб»). Яны ляжалі непасрэдна на зямлі і былі найбольш схільныя да ўздзеяння вільгаці.

Пад падруб звычайна падкладалі вялікія камяні, якія выконвалі ролю больш трывалага падмурка. Гэтыя камяні маглі замяняцца тоўстымі колодамі («штындары»), якія ўкопваліся на 3/4 сваёй даўжыні ў зямлю [3, с. 34]. Інфармацыя аб выкарыстанні такіх «штындароў» была атрымана ў час этнаграфічных экспедыцый у в. Марозавічы Пінскага р-на [9, арк. 45].

У час этнаграфічнай экспедыцыі 1977 г. пры абмеры хаты Ганны Цімафееўны Максімук (в. Матыкалы Брэсцкага р-на) была выяўлена глыбіня падмурка – 1 аршын (70 см) [8, арк. 99]. Такі спосаб будаўніцтва жылой хаты быў вельмі распаўсюджаны ў Брэсцкай вобласці.

***Тып планіроўкі.*** Планіровачная структура жылога комплексу Заходняга Палесся адрознівалася вялікай разнастайнасцю. Грунтоўныя даследаванні планіроўкі жылля былі праведзены этнографамі ІМЭФ падчас Брэсцкай этнаграфічнай экспедыцыі 1968 г. Былі даследаваны ўсе раёны Брэсцкай вобласці; справаздачы па выяўленні і атрыбуцыі жылых комплексаў захоўваюцца ў архіве ІМЭФ НАН Беларусі. Так, згодна з інфармацыяй, атрыманай ад Ціхана Хведаравіча Поніка (1896 г. нараджэння, в. Горталь Івацэвіцкага р-на) тып планіроўкі «хата + сені» часам сустракаўся ў пачатку XX ст., тып планіроўкі «хата + сені + хата» сустракаўся да 1941 г. Найбольш распаўсюджанай планіроўкай сядзібы у Івацэвіцкім р-не была «хата + сені + істопка (“сцёпка”)» [11], у Лунінецкім р-не – «хата + сені + істопка (“варыўня”)» [12].

Такім чынам, найбольш характэрнымі варыянтамі жылля ў Заходнім Палессі ў канцы XIX – пачатку XX ст. былі «хата + кухня / сені» і «хата + сенцы + камора» [7, с. 57]. Непасрэдна да хаты пад адну страху маглі прыбудоўвацца іншыя гаспадарчыя пабудовы альбо стаяць асобна.

У Заходнім Палессі былі такія гаспадарчыя пабудовы, як клець («свіран»), гумно («клуня»), хлеў, мякіннік («палоўнік») і інш. Сустракаўся і некалькі ўскладнены варыянт трохкамернага жылля, калі ў сенцах, куды выходзіла вусце печы, адгароджвалася кухня. Дыферэнцыяцыя жылога памяшкання па функцыянальных прыкметах у другой палове XIX – пачатку XX ст. ішла таксама шляхам вылучэння ў сенях спальні (хаткі) [7, с. 57], якая адгароджвалася ля сцяны, да якой з другога боку ў жылым памяшканні прымыкала печ. Аб гэтым сведчаць і матэрыялы экспедыцыі ў Столінскі р-н: «У сенцах выдзяляліся два памяшканні – сцебка са столлю і “задзец”, які служыў для летняга адпачынку, там спалі маладыя» [13, арк. 48].

***Страха.*** Большасць пабудоў Заходняга Палесся ў канцы XIX – пачатку XX ст. мела чатырохсхільную страху. Такі тып страхі быў зафіксаваны А. М. Харузіным у пачатку XX ст. (вёскі Шэні, Стараволя, Плебанцы, Паддубна, Агароднікі Пружанскага павета). Аналагічны тып страхі быў зафіксаваны навукоўцамі ў час этнаграфічных экспедыцый БДМНАП у Брэсцкім р-не ў 1977 г. [8, арк. 99], Кобрынскім, Пружанскім і іншых раёнах.

Другі тып – гэта двухсхільная страха. Паміж гэтымі двума тыпамі заўважаецца істотнае адрозненне. Двухсхільная страха мае больш стромкі дах, які ўтварае на франтоне т. зв. шчыт («зашчытак», «лоб», «чало»), складзены з дошак. Гэты шчыт надаваў дому больш адкрыты выгляд, тады як хата з чатырохсхільнай страхой мае больш буданападобны выгляд.

У пачатку XX ст. назіраўся шэраг пераходных формаў ад чатырохсхільных да двухсхільных дахаў. Пераходы гэтыя былі з боку франтона, які выходзіў да вуліцы. Такія пераходныя формы можна было сустрэць яшчэ ў другой палове XX ст. У час экспедыцый былі зафіксаваны такія формы страхі ў Камянецкім р-не: «абмералі і сфатаграфавалі пагонны двор з двухсхільным саламяным дахам з прычэлкам» [8, арк. 102], у Кобрынскім р-не [14, арк. 89адв.]. Калі страха была двухсхільнай, то на скрыжаванні закрылін утвараўся вільчык у выглядзе конскіх галоў, каровіных рогаў, фігурак птушак, павернутых у розныя бакі. Калі страха была саламяная, то для ўтрымання саломы папарна размяшчалі кароткія жэрдкі («козлы», «козлікі»), якія скрыжоўваліся над грэбнем страхі.

***Вокны і дзверы.*** У канцы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Заходняга Палесся былі распаўсюджаны вокны памерам 3/4 – 1 арш. (вышыня) і 1/2 – 3/4 арш. (шырыня) [3, с. 52]. Звычайна было тры акны: адно з боку франтону і два з доўгага боку дома (адно вялікае і адно малое).

У час экспедыцый БДМНАП былі зафіксіраваны валокавыя вокны на тэрыторыі Заходняга Палесся і зроблены іх абмеры. Так, у в. Кусцічы Камянецкага р-на была знойдзена старая рама (памерамі 52 × 67 см) [8, арк. 100]; у в. Плята ў хаце Дзмітрыя Сцяпанавіча Шырнюка памер старой рамы – 56 × 64 см.; у в. Радасць Камянецкага р-на памер акна 44 × 50 см [8, арк. 102]. Па словах Ірыны Маісееўны Власюк (1908 г. нараджэння, в. Лелікава Кобрынскага р-на), «у дзяцінстве хата была курной, замест вокнаў быў толькі прарэз у адным бервяне, і ў яе ўстаўлена шкло» [14, арк. 90адв.]. Аналагічныя абмеры вакон у старых жылых і гаспадарчых пабудовах былі зроблены і ў іншых раёнах Брэсцкай вобласці.

Дзверы звычайна размяшчаліся збоку дома ў панадворак. Аднак у Пружанскім і Кобрынскім паветах сустракаліся дамы, якія мелі ўваходныя дзверы з франтона, але гэтыя дзверы вялі не ў жылое памяшканне, а ў прылеглае да яго з боку франтона гаспадарчае – істопку ці хлеў [3, с. 55].

***Інтэр'ер хаты.*** Для Заходняга Палесся, як і для ўсёй Беларусі, характэрна кутняе размяшчэнне печы, вусце якой павернута да бакавой сцяны. Аналіз архіўных матэрыялаў паказаў, што інфарматары яшчэ ў 1960–70-х гг. памяталі, што на тэрыторыі Заходняга Палесся бытавалі курныя хаты. Згодна з архіўнымі матэрыяламі ІМЭФ у Іванаўскім р-не «курныя печы бытавалі ў канцы XIX; руская печ з комінам шырока пачала з'яўляцца напачатку XX ст.» [15]. Аналагічныя звесткі пра курныя печы былі зафіксаваны навуковымі супрацоўнікамі ІМЭФ у час Брэсцкай этнаграфічнай экспедыцыі 1968 г. у Лунінецкім р-не [12, арк. 7]; Івацэвіцкім р-не [11, арк. 6]. Аб бытаванні напачатку XX ст. курных печак сведчаць таксама архіўныя матэрыялы БДМНАП. Так, па словах Алены Якаўлеўны Мікус (1906 г. нараджэння, в. Плебанцы Пружанскага р-на), «былі курныя хаты, дым выходзіў праз "дырку ў паталку"» [16].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. у жыллі Заходняга Палесся разам з печчу з комінам ставілі спецыяльныя абагравальныя печы розных відаў («груба», «сцяна», «сцяноўка»).

Па дыяганалі ад печы ў жыллі знаходзілася найбольш каштоўная і ганаровая частка жылля селяніна – «покуць». Семітычная роля покуці падкрэслівалася і тым, што там захоўваліся найбольш каштоўныя культурныя сімвалы: абразы, Біблія, асвячоная вярба, свечкі і інш. Усё ў доме было зарыентавана ў адносінах да покуці: тут адбывалася трапеза і ўсе адзначаныя ў рэлігійным і рытуальным плане падзеі. На покуці звычайна знаходзіўся стол – адзін з найстаражытнейшых відаў перасоўнай мэблі. У Заходнім Палессі сталы часта рабіліся на казюлях, ці казлах – двух крыжавінах, злучаных ашэсткам. Аб гэтым сведчаць і архіўныя матэрыялы з экспедыцыі БДМНАП: «Лавы былі на ножках. Сталы на козлах і на ножках» (в. Плебанцы Пружанскага р-на) [16]. У час экспедыцый было выяўлена сімвалічнае значэнне стала ў каляндарных і сямейных абрадах рэгіёна.

Уздоўж франтоннай і бакавой сцяны размяшчаліся шырокія лавы, якія сыходзіліся на покуці. Лавы звычайна выраблялі з добрай драўніны (часам з ліпы). «Памеры лавы ў шырыню вагаліся ад 6 да 12 вяршкоў і перадаваліся з пакалення ў пакаленне» [3, с. 202]. Яны служылі месцам адпачынку і працы. Часта ў лавах рабілі адтуліны і цінскі для замацавання калаўротаў, часальных грабянёў, а часам ціскоў для сталярнага і іншых рамёстваў.

У архіўных матэрыялах БДМНАП прыводзіцца шмат іншых звестак пра прадметы ўнутранага абсталявання (спальнае месца, калыскі, прадметы побыту).

Так, у в. Плебанцы Пружанскага р-на, па звестках інфарматараў, «былі верхнія і ніжнія нары; лавы былі на ножках; калыскі плеценыя з каранеў падвешвалі на крук» [16]. Больш падрабязную інфармацыю аб месцы для сну можна знайсці ў даследаванні А. Харузіна: «Ад печы да франтоннай сцяны размяшчаецца месца для сну, якое мае розныя канструкцыі: альбо гэта дашчаныя нары ("пол"), роўныя па даўжыні адлегласці ад печы да франтоннай сцяны, а па шырыні – шырыні печы, альбо гэта памост на ножках, часам сустракаўся ложак». Варта адзначыць, што ў Пружанскім павеце Гродзенскай губерні нары-ложак часам называлі «покуць» – найменне ад кута, да якога яны прымыкалі [3, с. 203].

У другой палове XIX – пачатку XX ст. у Заходнім Палессі пол у хаце быў земляны ці глінабітны («ток»), радзей драўляная падлога.

Побач з апісаннямі жылых і гаспадарчых пабудоў Брэсцкай вобласці ў час экспедыцый навуковыя супрацоўнікі збіралі этнаграфічныя калекцыі для фарміравання экспазіцый інтэр'ера традыцыйнага жылля Заходняга Палесся: мэблю, прадметы інтэр'еру і побыту.

**Заключэнне**

Ітак, у артыкуле былі апісаны даследаваныя матэрыялы этнаграфічных экспедыцый, якія захоўваюцца ў архіве Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту і архіве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

У выніку даследавання былі зроблены наступныя высновы: для традыцыйнага жылля Заходняга Палесся найбольш характэрны пагонны аднарадны тып двара, часам сустракаецца двор з незвязанымі пабудовамі. Для будаўніцтва жылля выкарыстоўвалі сасну, радзей яліны. Традыцыйнай тэхнікай драўлянага будаўніцтва была зрубная тэхніка. Зруб жылля складаўся пераважна з пілаваных або расколатых уздоўж бярвенняў. Большасць пабудоў Заходняга Палесся ў канцы XIX – пачатку XX ст. мела чатырохсхільную страху. У пачатку XX ст. назіраўся шэраг пераходных форм ад чатырохсхільных да двухсхільных дахаў.

У разглядаемы перыяд на тэрыторыі рэгіёна былі распаўсюджаны вокны невялікіх памераў. Звычайна было тры акны: адно з боку франтону і два з доўгага боку дома.

Для Заходняга Палесся, як і для ўсёй Беларусі, характэрна кутняе размяшчэнне печы, вусце якой павернута да бакавой сцяны. Па дыяганалі ад печы ў жыллі знаходзілася найбольш каштоўная і ганаровая частка жылля селяніна – «покуць». Уздоўж франтоннай і бакавой сцяны размяшчаліся шырокія лавы, якія сыходзіліся на покуці.

Падчас этнаграфічных экспедыцый навукоўцы правялі абмеры жылых і гаспадарчых пабудоў, зрабілі замалёўкі і фотаздымкі канструкцыйных дэталяў жылых і гаспадарчых пабудоў.

Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый могуць быць выкарыстаны пры рэстаўрацыі і аднаўленні помнікаў драўлянага дойлідства ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Российская музейная энциклопедия : в 2 т. – М. : Прогресс : РИПОЛ КЛАССИК, 2001. – 416 с.

2. Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па Рэспубліцы Беларусь (05.09.1977 – 26.12.1977) // Архіў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (БДМНАП).

3. Харузин, А. Славянское жилище в Северо-Западном крае: из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Харузин. – Вильно : Типолитогр. Т-ва «Н. Мац и К°», 1907. – 341 с.

4. Лакотка, А. І. Дойлідства / А. І. Лакотка // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2015 – Т. 3 : Культура сяла XIV – пачатку XX ст. : у 2 кн. – Кн. 1 : Матэрыяльная культура. – С. 9–115.

5. Молчанова, Л. А. Материальная культура белорусов / Л. А. Молчанова ; ред.: В. К. Бондарчик, А. И. Залесский. – Минск : Наука и техника, 1968. – 231 с.

6. Милюченков, С. А. Сельские поселения XVI – начала XX в. : ист.-этногр. исслед. / С. А. Милюченков. – Минск : Беларус. навука, 2024. – 286 с.

7. Титов, В. С. Историко-этнографические регионы в экспозиции Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта / В. С. Титов. – Минск : Полымя, 1982. – 72 с.

8. Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па Рэспубліцы Беларусь (05.09.1977 – 26.12.1977). Справаздача аб камандзіроўцы ў Брэсцкі і Камянецкі раёны Брэсцкай вобласці (15.12.1977 – 21.12.1977) // Архіў БДМНАП.

9. Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па Рэспубліцы Беларусь (14.01.1978 – 27.05.1978). Справаздача аб камандзіроўцы ў Пінскі, Іванаўскі, Столінскі раёны Брэсцкай вобласці (27.03.1978 – 01.04.1978) // Архіў БДМНАП.

10. Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па Рэспубліцы Беларусь (11.04.1980 – 29.05.1980). Справаздача аб камандзіроўцы ў Маларыцкі раён Брэсцкай вобласці (24.04.1980) // Архіў БДМНАП.

11. Брэсцкая этнаграфічная экспедыцыя 1968 г., Івацэвіцкі раён // Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы (АІМЭФ) НАН Беларусі. – Ф. 6. Воп. 11. Спр. 804.
12. Брэсцкая этнаграфічная экспедыцыя 1968 г., Лунінецкі раён // АІМЭФ НАН Беларусі. – Ф. 6. Воп. 11. Спр. 794.
13. Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па Рэспубліцы Беларусь (16.09.1978 – 18.12.1978). Справаздача аб камандзіроўцы ў Столінскі раён Брэсцкай вобласці (21.09. 1978 – 01.10.1978) // Архіў БДМНАП.
14. Справаздачы аб камандзіроўках у Брэсцкую і Гомельскую вобласці (17.05.1978 – 22.05.1978). Справаздачы аб камандзіроўках у Кобрынскі, Маларыцкі і Драгічынскі раёны Брэсцкай вобласці (18.05.1978 – 22.05. 1978) // Архіў БДМНАП.
15. АІМЭФ НАН Беларусі. – Ф. 6. Воп. 11. Спр. 800.
16. Экспедыцыі ў Пружанскі раён Брэсцкай вобласці (1980, 1981 гг.) // Асабісты архіў аўтара.

REFERENCES

1. Rossiiskaya muzeinaya entsiklopediya : v 2 t. – M. : Progress : RIPOL KLASSIK, 2001. – 416 s.
2. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa Respublitsy Belarus’ (05.09.1977 – 26.12.1977) // Arkhiuў Belaruskaga dzyarzhaunaga muzeya narodnai arkhitektury i pobytu (BDMNAP).
3. Kharuzin, A. Slavyanskoe zhilishche v Severo-Zapadnom krae: iz materialov po istorii razvitiya slavyanskikh zhilishch / A. Kharuzin. – Vil’no : Tipolitogr. T-va «N. Mats i K°», 1907. – 341 s.
4. Lakotka, A. I. Doilidstva / A. I. Lakotka // Narysy gistoryi kul’tury Belarusi : u 4 t. / A. I. Lakotka [i insh.] ; navuk. red. A. I. Lakotka. – Minsk : Belarus. navuka, 2015 – T. 3 : Kul’tura syala XIV – pachatku XX st. : u 2 kn. – Kn. 1 : Materyyal’naya kul’tura. – S. 9–115.
5. Molchanova, L. A. Material’naya kul’tura belorusov / L. A. Molchanova ; red.: V. K. Bondarchik, A. I. Zalesskii. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1968. – 231 s.
6. Milyuchenkov, S. A. Sel’skie poseleniya XVI – nachala XX v. : ist.-etnogr. issled. / S. A. Milyuchenkov. – Minsk : Belarus. navuka, 2024. – 286 s.
7. Titov, V. S. Istoriko-etnograficheskie regiony v ekspozitsii Belorusskogo gosudarstvennogo muzeya narodnoi arkhitektury i byta / V. S. Titov. – Minsk : Polymya, 1982. – 72 s.
8. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa Respublitsy Belarus’ (05.09.1977 – 26.12.1977). Spravazdacha ab kamandziroutsy u Brestski i Kamyanetski raeny Brestskai voblastsi (15.12.1977 – 21.12.1977) // Arkhiu BDMNAP.
9. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa Respublitsy Belarus’ (14.01.1978 – 27.05.1978). Spravazdacha ab kamandziroutsy u Pinski, Ivanauski, Stolinski raeny Brestskai voblastsi (27.03.1978 – 01.04.1978) // Arkhiu BDMNAP.
10. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa Respublitsy Belarus’ (11.04.1980 – 29.05.1980). Spravazdacha ab kamandziroutsy u Malarytski raen Brestskai voblastsi (24.04.1980) // Arkhiu BDMNAP.
11. Brestskaya etnagrafichnaya ehkspedytsyya 1968 g., Ivatsehvitski raen // Arkhiu Instytuta mastatstvaznaustva, etnagrafii i fal’kloru imya Kandrata Krapivy (AIMEF) NAN Belarusi. – F. 6. Vop. 11. Spr. 804.
12. Brestskaya etnagrafichnaya ekspedytsyya 1968 g., Luninetski raen // AIMEF NAN Belarusi. – F. 6. Vop. 11. Spr. 794.
13. Spravazdachy ab navukovykh kamandziroukakh pa Respublitsy Belarus’ (16.09.1978 – 18.12.1978). Spravazdacha ab kamandziroutsy u Stolinski raen Brestskai voblastsi (21.09. 1978 – 01.10.1978) // Arkhiu BDMNAP.
14. Spravazdachy ab kamandziroukakh u Brestskuyu i Gomel’skuyu voblastsi (17.05.1978 – 22.05.1978). Spravazdachy ab kamandziroukakh u Kobrynski, Malarytski i Dra¬gichynski raeny Brestskai voblastsi (18.05.1978 – 22.05. 1978) // Arkhiu BDMNAP.
15. AIMEF NAN Belarusi. – F. 6. Vop. 11. Spr. 800.
16. Ekspedytsyi ў Pruzhanski raen Brestskai voblastsi (1980, 1981 gg.) // Asabisty arkhiu autara.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 29.05.2025*